НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
Інстытут гісторыі

# МАТЭРЫЯЛЫ ПА АРХЕАЛОГІІ БЕЛАРУСІ

# MATERIALS ON THE ARCHAEOLOGY OF BELARUS

ЗБОРНІК НАВУКОВЫХ АРТЫКУЛАЎ

Заснаваны ў 1957 годзе

35

ВЫПУСК / ISSUE

Мінск
«Беларуская навука»
2025

Нацыянальная бібліятэка Беларусі

УДК 902/904"653"(476.1)

У чарговым выданні Інстытута гісторыі НАН Беларусі прадстаўлены навуковыя артыкулы, матэрыялы, звесткі аб палявых працах і рэцэнзія, якія ўводзяць у навуковы ўжытак вынікі археалагічных даследаванняў помнікаў каменнага і бронзавага вякоў, жалезнага веку, Сярэдневякоўя, Новага і Навейшага часу.

Зборнік навуковых прац разлічаны на археолагаў, гісторыкаў, краязнаўцаў, музейных работнікаў, настаўнікаў і ўсіх тых, хто любіць старажытную гісторыю, цікавіцца матэрыяльнай і духоўнай культурай нашых далёкіх продкаў.

Укладальнік

В. І. Кошман, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

Рэдакцыйная калегія:

В. Л. Лакіза, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (галоўны рэдактар);
А. Г. Калечыц, доктар гістарычных навук, прафесар (намеснік галоўнага рэдактара);
А. М. Аўласовіч, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (адказны сакратар);
А. А. Башкоў, доктар гістарычных навук, дацэнт;
А. В. Вайцяховіч, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;
Д. У. Дук, доктар гістарычных навук, прафесар;
В. І. Кошман, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;
П. С. Курловіч, кандыдат гістарычных навук, дацэнт;
А. М. Кушнярэвіч, доктар мастацтвазнаўства, прафесар;
І. А. Марзалюк, доктар гістарычных навук, прафесар,
член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі;
А. А. Мяцельскі, доктар гістарычных навук, дацэнт;
С. А. Піваварчык, доктар гістарычных навук, дацэнт;
А. Г. Сітдзікаў, доктар гістарычных навук, член-карэспандэнт
Акадэміі навук Рэспублікі Татарстан (Расійская Федэрацыя);
М. М. Чарняўскі, кандыдат гістарычных навук;
С. С. Юрэцкі, кандыдат гістарычных навук;
С. Д. Дзярновіч (тэхнічны сакратар)

Навуковы рэдактар

В. Л. Лакіза, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

Рэцэнзенты:

доктар гістарычных навук дацэнт А. А. Мяцельскі,
доктар гістарычных навук дацэнт А. А. Башкоў

*Выданне падрыхтавана ў рамках выканання дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2021–2025 гады «Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы» (навуковы кіраўнік – акадэмік, доктар гістарычных навук, прафесар А. А. Каваленя), падпраграмы 12.1 «Гісторыя» (навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук дацэнт В. Л. Лакіза), базавага задання 12.1.1 «Археалагічная спадчына як фактар забяспячэння гуманітарнай бяспекі беларускага грамадства» (кіраўнік – кандыдат гістарычных навук дацэнт В. І. Кошман).*

*Рэкамендавана да друку Вучоным саветам Інстытута гісторыі НАН Беларусі (пратакол № 3 ад 27 лютага 2025 г.).*

На вокладцы змешчаны дэкаратыўны элемент стрэмені X–XI стст., выяўлены А. В. Вайцяховічам падчас даследаванняў 2024 г. на «Малым гарадзішчы» археалагічнага комплексу на рацэ Менка Мінскага раёна.

© ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі», 2025
© Афармленне. РУП «Выдавецкі дом «Беларуская навука», 2025

*УДК 903.41(476.1)*

***П. С. Курловіч***, *Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, гістарычны факультэт, загадчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (г. Мінск, Беларусь);*

***А. А. Сазонаў***, *Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, факультэт геаграфіі і геаінфарматыкі, кафедра глебазнаўства і геаінфармацыйных сістэм, старшы выкладчык (г. Мінск, Беларусь)*

# Гарадзішчы Харытанцы – Забарочча, Радзіца, Грыцковічы Крупскага раёна Мінскай вобласці: вынікі абследаванняў 2023 года[1]

Ключавыя словы: гарадзішчы, жалезны век, паветранае лазернае сканаванне, лічбавая мадэль рэльефу, наканечнік дроціка, кераміка, праселкі.

Фіксацыя помнікаў з вызначэннем іх дакладнай лакалізацыі на мясцовасці – адна з ключавых задач сучаснай археалогіі. Выкарыстанне для гэтых мэт паветранага лазернага сканавання ўпершыню на тэрыторыі Беларусі дазваляе за мінімальны час ахапіць тапаграфічнымі здымкамі значныя ўчасткі мясцовасці. Атрыманае ў выніку сканавання воблака кропак дае магчымасць стварыць мадэль рэльефу мясцовасці, схаванага пад лясной ці драўняна-хмызняковай расліннасцю з высокай, геадэзічнай дакладнасцю. Пачынаючы з вясны 2022 г., аўтарамі артыкула сумесна з іншымі даследчыкамі (А. В. Вайцяховічам, М. А. Плавінскім, В. А. Макоўскай) былі праведзены працы па паветраным лазерным сканаванні шэрага паселішчаў і курганных могільнікаў на тэрыторыі Мінскага, Вілейскага, Мядзельскага, Глыбоцкага і Шаркаўшчынскага раёнаў.

У жніўні 2023 г. былі праведзены працы па атрыманні лічбавай мадэлі ўрочышча Выспа на возеры Сялява [1], на якім размешчаны гарадзішча і селішча I тысячагоддзя н. э. Клішына, а таксама шэраг помнікаў больш ранняга часу [2, 3][2]. Дадаткова было выканана абследаванне трох аб'ектаў на тэрыторыі Крупскага раёна, якія знаходзіліся на адлегласці да 20 км (мал. 1)[3]. Паколькі працы праводзіліся ў летні перыяд, было вырашана сканцэнтравацца на гарадзішчах, якія лепш вылучаюцца ў рэльефе, чым іншыя віды помнікаў. Абследаванне ўключала ў сябе візуальны агляд аб'екта і фіксацыю яго стану на момант даследавання, паветранае лазернае сканаванне тэрыторыі разам з прылягаючым ландшафтам з наступнай пабудовай лічбавай мадэлі рэльефу.

У якасці носьбіта карыснай нагрузкі пры паветраным лазерным сканаванні помнікаў выкарыстоўвалі беспілотны лятальны апарат (далей – БПЛА) DJI Matrice 300 RTK. Лазерны сканер DJI Zenmuse L1, які ўжыты пры даследаванні, дазваляе атрымліваць да трох адлюстраванняў лазернага праменя, мае дыяпазон выяўлення 450 м пры каэфіцыенце адлюстравання 80 % і 190 м пры каэфіцыенце адлюстравання 10 %, забяспечвае шчыльнасць воблака кропак на ўзроўні 100 крп/м$^2$ пры вышыні палёту 100 м, дакладнасць атрымання каардынат па гарызанталі складае 10 см, па вертыкалі – 5 см пры вышыні палёту 50 м.

Постапрацоўку першасных даных ажыццяўлялі пры дапамозе праграмнага забеспячэння DJI Terra. Пасля гэтага атрымлівалі воблакі кропак у фармаце LAS/LAZ для далейшага аналізу і пабудовы лічбавай мадэлі рэльефу. У працэсе постапрацоўкі ўсталёўвалі сістэму каардынат выходных даных,ураўноўвалі воблакі кропак і рабілі іх каларызацыю на падставе фотаздымкаў, атрыманых падчас аэрафотаздымкі.

Атрыманыя воблакі кропак загружалі ў спецыялізаванае праграмнае забеспячэнне QuickTerrainModeler і ArcGIS для класіфікацыі, якая дазваляе аднесці кропкі да наступных класаў: зямля (ground), некласіфікаваныя кропкі (default), нізкая расліннасць (low vegetation), сярэдняя расліннасць (medium vegetation), высокая расліннасць (high vegetation), будынкі (building) і г. д. На падставе класіфікаваных воблакаў кропак можна пабудаваць лічбавую мадэль рэльефу з распазнавальнай здольнасцю ад 0,3 м і менш. Выкарыстанне QuickTerrainModeler з'яўляецца неабходным на палявым этапе даследавання для аператыўнага

[1] Артыкул падрыхтаваны пры фінансавай падтрымцы Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў у межах выканання навукова-даследчай работы «Применение воздушного лазерного сканирования на базе БПЛА для сохранения и изучения археологических объектов на территории Беларуси (на примере археологического наследия Полоцкой земли)» № Г23ИП-038 ад 02.05.2023.

[2] Інтэрпрэтацыя даных паветранага лазернага сканавання ўрочышча Выспа адносна размяшчэння археалагічных помнікаў рознага часу плануецца ў асобнай публікацыі.

[3] Аўтары артыкула выказваюць шчырую падзяку за дапамогу ў абследаванні гарадзішчаў краязнаўцу А. П. Аляхновічу.




Мал. 1. Абследаваныя ўчасткі каля воз. Сялява. Крупскі раён. Мінская вобласць. 2023 г.

кантролю вынікаў сканавання. Для пабудовы канчатковых лічбавых мадэлей рэльефу лепшыя вынікі дэманструе ArcGIS (група прылад 3D Analyst), але для яго выкарыстання патрабуецца больш часу на апрацоўку і аналіз даных.

***Гарадзішча Харытанцы – Забарочча («Гара»)*[1].** Лакалізавана на адлегласці прыкладна ў 1 км на поўнач ад в. Харытанцы і прыкладна ў 1,2 км на поўдзень ад в. Забарочча Кастрычніцкага сельсавета Крупскага раёна Мінскай вобласці. Размешчана на левым беразе р. Ракітаўка, на ўзгорку марэннага паходжання вышынёй каля 7 м са штучна эскарпаванымі схіламі (мал. 2). З паўночнага боку тэрыторыя абмежавана поймай Ракітаўкі (па выніках лідарнай здымкі бачна, што старыца ракі ўшчыльную падыходзіла да падножжа гарадзішча), з заходняга – забалочаным участкам, з усходняга – дарогай. З паўднёвага боку знаходзіцца закінуты кар'ер па здабычы пяску, які часткова пашкодзіў гарадзішча і зараз выкарыстоўваецца пад сметнік. Захавалася частка пляцоўкі, зарослая хмызняком і дрэвамі, памерамі прыкладна 20 м × 40 м, выцягнутая ў напрамку з поўначы на поўдзень. Культурны слой, прадстаўлены цёмна-шэрай супессю, з пашкоджанага боку гарадзішча візуальна прасочаны на глыбіню каля 1 м на ўскрайку і каля 20 см бліжэй да цэнтру пляцоўкі.

Перададзены ў вучэбную лабараторыю музейнай справы гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта пад'ёмны матэрыял з гарадзішча прадстаўлены пераважна дробнымі фрагментамі посуду і металургічным жужалем. Канкрэцыі жужалю масіўныя, агульнай вагой каля 4,7 кг. На некаторых асобніках захаваліся сляды гліны ад сырадутнага горна і адбіткі ад выпаленага драўнянага вугалю. Кераміка ляпная, гладкасценная і са штрыхоўкай паверхні, 22 фрагменты, абсалютную большасць складаюць сценкі пасудзін. Адзінае венца дробнае, не дазваляе вызначыць прафіліроўку вырабу. На жаль, сабраны матэрыял не дазваляе дакладна ўстанавіць храналогію абследаванага гарадзішча. Відавочна, насельніцтва займалася тут чорнай металургіяй, магчыма, прыкладна ў першых стагоддзях нашай эры.

***Гарадзішча Радзіца («Акоп»).*** Знаходзіцца ў цэнтры в. Радзіца Ігрушкоўскага сельсавета Крупскага раёна Мінскай вобласці, на поўдзень ад вясковых могілак, на левым беразе каналізаванай р. Блудыня (левы прыток р. Нача). Выяўлена Л. Д. Побалем у 1990 г. [4, с. 33]. З паўночнага і заходняга бакоў абмяжоўваецца поймай. Схілы стромкія. Перапад вышынь паміж пляцоўкай і поймай – каля 4 м (мал. 3). Зараз адлегласць паміж заходнім краем гарадзішча

[1] Тут і далей – у дужках змешчаны назвы мясцовасці паводле звестак, атрыманых ад мясцовых жыхароў.




Мал. 2. Гарадзішча Харытанцы – Забарочча. Крупскі раён. Мінская вобласць. Лічбавая мадэль рэльефа. 2023 г.




Мал. 3. Гарадзішча Радзіца. Крупскі раён. Мінская вобласць. Лічбавая мадэль рэльефа. 2023 г.

і руслам Блудыні складае каля 60 м, але, верагодна, раней рака магла працякаць пад самымі схіламі. З усходняга і паўднёвага бакоў вышыня пляцоўкі знаходзіцца на адным узроўні з навакольнай мясцовасцю. Ад яе гарадзішча было аддзелена рвом шырынёй каля 4 м і глыбінёй каля 1,5 м. З усходняга боку ў ім маецца перамычка. На даўжыню рова па краі пляцоўкі маецца вал вышынёй да 1 м. Рэшткі зруйнаваных умацаванняў прасочваюцца і з паўночнага боку. Пляцоўка авальнай формы, выцягнутая з поўначы на поўдзень. Памеры прыкладна 70 м × 60 м. На момант абследавання гарадзішча было моцна зарослае буйной травой, а таксама асобнымі дрэвамі.

У 2001 г. на частцы пляцоўкі гарадзішча, адсунутай да дарогі, былі сабраныя знаходкі, перададзеныя ў 2023 г. у фонды вучэбнай лабараторыі музейнай справы гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (48 прадметаў): 1 экз. жалезнага наканечніка дроціка, 39 фрагментаў керамічнага посуду, 2 фрагменты гліняных праселак, 1 фрагмент металургічнага жужалю, 3 фрагменты перапаленай гліны і 2 фрагменты глінянай абмазкі.

Фрагменты праселак адносяцца да вырабаў шарападобнай і біканічнай формы (мал. 4: *2*, *3*). З-за таго, што праселкі захаваліся толькі ў фрагментах, іх складана аднесці да пэўных тыпаў існуючых на дадзены момант класіфікацый. Біканічны фрагмент зусім дробны. Можна заўважыць толькі тое, што яго можа датаваць у межах другой – трэцяй чвэрці I тысячагоддзя н. э. Шарападобны выраб можа быць аднесены да варыянта Д тыпу II ці V паводле А. М. Мядзведзева [5, с. 42–43] і А. У. Ільюцік [6], а таксама тыпу I паводле В. І. Шадыры [2, с. 215], які адзначае, што такія праселкі з'яўляюцца найбольш ранні́мі на гарадзішчы Клішына [2, с. 224–225]. У любым выпадку, дадзеныя праселкі сустракаюцца сярод асобных старажытнасцей культуры позняй штрыхаванай керамікі і позняга этапу днепра-дзвінскай культуры.

Найбольшую цікавасць уяўляе жалезны наканечнік двухшыпнага дроціка (мал. 4: *1*). Даўжыня вырабу – 16,5 см, даўжыня пяра – 2,8 см. Такім чынам, іх суаднясенне складае прыкладна 6 : 1. Верхняя частка ўтулкі (рус. тульѝ) крыху сплошчаная, з зазорам амаль у 2,0 см. Яе шырыня – 2,5 см. Шырыня вырабу пад пяром – 1,1 см. Шырыня пяра ў найбольшай частцы – 2,4 см, сячэнне лінзападобнае. Шыпы кароткія, каля 0,3 см. Наканечнік дэфармаваны, паверхня каразіравана. Варта адзначыць, што з усяго масіву жалезных двухшыпных наканечнікаў дроцікаў, дастаткова шырока распаўсюджаных на тэрыторыі Усходняй Еўропы ў апошнія стагоддзі да н. э. – сярэдзіне I тысячагоддзя н. э., асобнік з Радзіцы вылучаецца кароткім пяром з кароткімі шыпамі і дастаткова шырокай верхняй часткай утулкі.

Найбольш падобныя па марфалогіі наканечнікі дроцікаў можна знайсці сярод вырабаў тыпу F1 па класіфікацыі А. А. Радзюша, якія ён разглядае як працяг зарубінецкіх традыцый [7, с. 165; 8, мал. 51]. Па тыпалогіі П. Качаноўскага, для ўзбраення пшэворскай культуры наканечнікі невялікага памеру з кароткім пяром і кароткімі шыпамі адносяцца да тыпу D, які датаваны фазай B1 (0–75 гг.) [9, с. 30–31, табл. LXVI: *6*]. Аднак дадзены тып у даследчыка прадстаўлены толькі адным вырабам, у якога абодва шыпы адламаныя.

Падобныя па прапорцыях і афармленні пяра прадметы з тэрыторыі Польшчы паходзяць са збораў з воз. Любанова [10, мал. 5: *5*] і з могільніку рымскага часу ў Чэліне [11, с. 227]. Дадзеныя знаходкі суадносяцца даследчыкамі са скандынаўскімі наканечнікамі тыпу Hval, выяўленымі на тэрыторыі Нарвегіі, Швецыі і Даніі, якія адрозніваюцца ад наканечніка з Любанова гранёнай верхняй часткай утулкі [12, с. 242; 13, с. 433–434]. Наканечнікі тыпу Hval




Мал. 4. Знаходкі: *1* – наканечнік жалезнага дроціка; *2*, *3* – гліняныя праселкі (фрагменты); *4–10* – кераміка (фрагменты). Гарадзішча Радзіца. Крупскі раён. Мінская вобласць. 2023 г. Малюнак П. С. Курловіч

датаваны цэнтральнаеўрапейскай фазай C1a рымскага часу (другой паловай II – пачаткам III ст. н. э.) [12, с. 241–242]. Яшчэ адзін наканечнік дроціка з падобнымі прапорцыямі (даўжыня вырабу – 12 см, даўжыня пяра – 2 см) і кароткімі шыпамі паходзіць з кургана № 2, які датаваны III–IV стст., могільніка Дзірмішкес з тэрыторыі Літвы [14, с. 57].

Марфалагічна падобныя да вырабу з Радзіцы наканечнікі двухшыпных дроцікаў вядомыя і на тэрыторыі Беларусі. Найбольш блізкі асобнік знойдзены на селішчы Струмень-5 Кармянскага раёна Гомельскай вобласці [15, с. 262, мал. 97: *2*]. Іншы выраб паходзіць з верхняга пласта гарадзішча Загаваліна Ушацкага раёна Віцебскай вобласці [16, с. 35]. Аднак гэты прадмет мае больш масіўнае пяро з больш доўгімі шыпамі і іншае суаднясенне паміж даўжынёй вырабу і пяра. Наканечнікі дзідаў і дроцікаў з кароткімі шыпамі выяўлены на гарадзішчы Нікадзімава Горацкага раёна Магілёўскай вобласці [17, с. 21–22]. Але форма пяра і суаднясенне паміж даўжынёй пяра і даўжынёй вырабу ў іх таксама моцна адрозніваюцца ад прадмета з Радзіцы.

Кераміка ў складзе калекцыі прысутнічае як ганчарная (Новага часу), так і ляпная. Да ганчарнай керамікі адносяцца 2 экз. венцаў ад пасудзін з высокім акруглым плечыкам, якое пачынаецца адразу пад краем венца, 6 фрагментаў сценак і 2 фрагменты донцаў. У адным венцы край патоўшчаны і адцягнуты вонкі (мал. 4: *5*), у другім па плечыку праходзіць хвалістая лінія (мал. 4: *6*). Венцаў ляпных пасудзін таксама два. Першае прадстаўлена дробным фрагментам, другое высокае, круху адагнутае вонкі, з падпрамакутным краем, адламанае каля пераходу да шыйкі (мал. 4: *4*). Аб тым, што на помніку сустракаліся слабапрафіляваныя пасудзіны з вылучанай шыйкай, сведчаць знаходкі яшчэ трох фрагментаў такой формы (мал. 4: *7*, *9*). Пры гэтым у двух з іх шыйка адмыслова пракрэслена лініяй. Найбліжэйшыя знаходкі посуду з такой прафіліроўкай зафіксаваны ў ніжніх пластах гарадзішча і селішча Клішына [2, с. 233–234, 238], на гарадзішчах ранняга жалезнага веку басейна р. Бярэзіна [18, с. 36–39]. У цэлым цеста ляпной керамікі ўтрымлівае вялікую колькасць буйной жарствы. 26 фрагментаў маюць на паверхні штрыхоўку, 1 фрагмент – бугрыстую паверхню. Цікавасць уяўляе невялікі фрагмент сценкі з арнаментам, утвораным шчыльнымі радамі з зашчыпаў (мал. 4: *8*). В. І. Шадыра прыводзіць малюнак падобных фрагментаў з селішча Тарылава Браслаўскага раёна Віцебскай вобласці [19, табл. 16: *27–29*]. Паводле А. А. Егарэйчанкі, кераміка з пальцавымі зашчыпамі сустракаецца ва ўсім арэале культуры позняй штрыхаванай керамікі [20, с. 77].

***Гарадзішча Грыцковічы («Вялікая Гара»).*** Размешчана на адлегласці прыкладна ў 1,5 км напрамкі ад цэнтра в. Грыцковічы Халапеніцкага сельсавета Крупскага раёна Мінскай вобласці (мал. 5). Звесткі аб помніку вядомыя па публікацыях Л. Д. Побаля [4, с. 36; 15, с. 361]. З-за размяшчэння аб’екта яго візуальнае абследаванне здзейсніць было немагчыма, таму працы вяліся толькі пры дапамозе паветранага лазернага сканавання. Падчас аналізу атрыма-




Мал. 5. Гарадзішча Грыцковічы. Крупскі раён. Мінская вобласць. Лічбавая мадэль рэльефа. 2023 г.

ных даных былі зафіксаваныя сляды антрапагеннага характару на краі грады, якая знаходзіцца на паўднёвы захад ад асушанага балота (пойма р. Эса). Аднак вызначыць іх структуру на дадзены момант не ўяўляецца магчымым. Аб'ект патрабуе дадатковага абследавання.

Такім чынам, па выніках абследаванняў былі створаныя лічбавыя мадэлі трох археалагічных аб'ектаў. З-за таго, што працы праводзілі ў летні перыяд, якасць паветранага лазернага сканавання была не самая высокая. Аднак атрыманыя вынікі дазваляюць прасачыць асаблівасці будовы гарадзішчаў і атрымаць іх прывязку на мясцовасці (хутчэй і дакладней, чым пры выкарыстанні класічнай тапаграфічнай здымкі).

Асноўная жыццядзейнасць на гарадзішчах Харытанцы – Забарочча і Радзіца ажыццяўлялася прыкладна ў першай палове I тысячагоддзя н. э. Для вызначэння характару культурнага слою і ўдакладнення храналогіі помнікаў тут неабходна правесці шурфоўку. Дадатковага абследавання патрабуе гарадзішча Грыцковічы, бо пакуль што не ўсталяваны ні яго будова, ні культурна-гістарычная прыналежнасць.

## Літаратура і крыніцы

1. Моделирование рельефа по данным воздушного лазерного сканирования на примере острова Выспа / А. А. Сазонов, П. С. Курлович, И. С. Князев, А. Н. Вашанов // ГИС-технологии в науках о Земле : материалы респ. науч.-практ. семинара студентов и молодых ученых, г. Минск, 15 нояб. 2023 г. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: А. Н. Червань (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 2023. – С. 145–154.

2. Шадыра, В. І. Матэрыяльная культура археалагічнага комплексу на возеры Селява ў Дняпроўска-Дзвінскім міжрэччы: I–VIII стст. н. э. / В. І. Шадыра // Славяне на территории Беларуси в догосударственный период : к 90-летию со дня рождения Леонида Давыдовича Поболя : в 2 кн. / О. Н. Левко [и др.] ; науч. ред.: О. Н. Левко, В. Г. Белевец ; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. – Минск, 2016. – Кн. 2. – С. 197–255.

3. Шадыра, В. І. Гарадзішча Клішына («Выспянская гара») Крупскага раёна (раскопкі 1999–2002 гг.) / В. І. Шадыра // Гістарычна-археалагічны зборнік (далей – ГАЗ). – 2004. – № 19. – С. 115–125.

4. Побаль, Л. Д. Старажытнасці Крупшчыны / Л. Д. Побаль // Памяць: Крупскі раён: гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / склад. і навук. рэд. Дз. М. Хромчанка. – Мінск : БелЭН, 1999. – С. 25–37.

5. Медведев, А. М. Верхнее Понеманье в железном веке и раннем Средневековье / А. М. Медведев. – Минск : Беларус. навука, 2011. – 350 с.

6. Ильютик, А. В. Пряслица и грузики из городищ раннего железного века бассейна Березины / А. В. Ильютик // ГАЗ. – 1994. – № 5. – С. 183–198.

7. Радюш, О. А. Вооружение и кавалерийское снаряжение населения западной части Восточной Европы (II в. до н. э. – V в. н. э.) : дис. ... канд. ист. наук : 5.6.3 : в 2 т. / Радюш Олег Александрович. – М., 2022. – Т. 1 : [Текст]. – 482 л.

8. Радюш, О. А. Вооружение и кавалерийское снаряжение населения западной части Восточной Европы (II в. до н. э. – V в. н. э.) : дис. ... канд. ист. наук : 5.6.3 : в 2 т. / Радюш Олег Александрович. – М., 2022. – Т. 2 : [Приложения]. – 232 л.

9. Kaczanowski, P. Klasyfikacja grotów broni drzewcowej kultury przeworskiej z okresu rzymskiego / P. Kaczanowski. – Kraków : Instytut Archeologii i Etnologii PAN, Uniwersytet Jagielloński, 1995. – 77 s.

10. Kontny, B. Roman-period sacrificial offerings in Lake Lubanowo / B. Kontny // Inventory, offerings and rituals in the pre-Christian temples and sacred places of Continental Europe and Mediterranean area (7 c. BC–2 c. AD): Proceedings of the 3 International Colloquium "Iron Age Sanctuaries and Cult Places at the Thracians and their Neighbours", 16th–19th June, 2022, Alun (Romania) / edited by Valeriu Sîrbu and Aurora Peţan. – Alun, 2023. – P. 161–178.

11. Rogalski, B. Uzbrojenie znad dolnej Odry w okresie rzymskim na przykładach cmentarzysk w Czelinie (dawn. Zellin), Starych Łysogórkach (dawn. Alt Lietzegöricke) i Żelisławcu (dawn. Sinzlow), pow. Gryfiński / B. Rogalski // Barbaricum. – 2021. – T. 13. – S. 219–245.

12. Kontny, B. Analiza archeologiczna znalezisk z lubanowskiego jeziora / B. Kontny, T. Nowakiewicz, A. Rzeszotarska-Nowakiewicz // Starożytne miejsce ofiarne w jeziorze w Lubanowie (d. Herrn-See) na Pomorzu Zachodnim / pod red. T. Nowakiewicza. – Warszawa, 2016. – P. 236–280.

13. Bemmann, J. Waffenführende Grabinventare der jüngeren römischen Kaiserzeit und Völkerwanderungszeit in Skandinavien. Studie zur zeitlichen Ordnung anhand der norwegischen Funde / J. Bemmann, G. Hahne // Bericht der Römisch-Germanischen Kommission. – Mainz am Rhein, 1994. – Bd. 75. – S. 283–653.

14. Michelbertas, M. Senojo geležies amžiaus ietigalių su užbarzdomis radiniai Lietuvoje ir jų chronologija / M. Michelbertas // Archaeologia Lituana. – 1999. – Vol. 1. – P. 56–62.

15. Поболь, Л. Д. Археологические памятники Белоруссии. Железный век / Л. Д. Поболь. – Минск : Наука и техника, 1983. – 429 с.

16. Шут, К. П. Городище Заговалино Ушачского района / К. П. Шут // Вопросы истории : тез. докл. XII конф. молодых ученых Белорус. ССР, Минск, ноябрь 1969 г. – Минск, 1969. – С. 31–42.

17. Седин, А. А. Предметы вооружения, снаряжения всадника и верхового коня из городища Никодимово / А. А. Седин ; Могилёвский обл. краевед. музей им. Е. Р. Романова. – Могилёв : МОКМ, 2012. – 64 с.

18. Ильютик, А. В. О датировке и культурной принадлежности ранних городищ железного века в бассейне Березины / А. В. Ильютик // ГАЗ. – 2002. – № 17. – С. 35–41.

19. Шадыра, В. І. Беларускае Падзвінне (І тысячагоддзе н. э.) / В. І. Шадыра ; НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : ІГ НАН Беларусі, 2006. – 150 с.

20. Егорейченко, А. А. Культуры штрихованной керамики / А. А. Егорейченко ; Белорус. гос. ун-т. – Минск : БГУ, 2006. – 207 с.

## Резюме

*П. С. Курлович, А. А. Сазонов*

### Городища Хаританцы – Заборочье, Радица, Грицковичи Крупского района Минской области: результаты обследований 2023 года

Ключевые слова: городища, железный век, воздушное лазерное сканирование, цифровая модель рельефа, наконечник дротика, керамика, пряслица.

В статье рассматриваются результаты обследований городищ Хаританцы – Заборочье, Радица и Грицковичи Крупского района Минской области в 2023 г. В результате воздушного лазерного сканирования объектов были получены их цифровые модели, точно локализованные на местности. Подъемный материал с первых двух городищ, переданный в учебную лабораторию музейного дела исторического факультета Белорусского государственного университета, позволяет определить их предварительную хронологию в пределах первой половины I тысячелетия н. э. Городище Грицковичи требует дополнительного обследования.

## Summary

*P. Kurlovich, A. Sazonau*

### Hillforts Kharitantsi – Zaborochcha, Raditsa, Hrytskovichi in the Krupsky district of the Minsk region: results of survey in 2023

Keywords: hillforts, Iron Age, aerial laser scanning, digital elevation model, javelin tip, pottery, spindle whorls.

The article is devoted to the results of the Kharitantsi – Zaborochcha, Raditsa and Hrytskovichi settlements reconnaissance in the Krupki district of the Minsk region in 2023. As a result of aerial laser scanning of the objects, their digital models, precisely localized on the terrain, were obtained. The collected material from the first two hillforts transferred to the educational laboratory of museum affairs of the Faculty of History of Belarusian State University allows us to determine their previous chronology within the first half of the 1st millennium AD. Hrytskovichi settlement requires additional reconnaissance.

*Паступіў 15.12.2024*